# «Памер МЗП зноў вырас»

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 2021 г.N 721 "Аб устанаўленні памеру месячнай мінімальнай заработнай платы" з 1 студзеня 2022 г. мінімальная заработная плата ўстаноўлена ў памеры 457 рублёў.

Згодна з нормамі Закона Рэспублікі Беларусь ад 7 мая 2021 г. N98-З "Аб змяненні законаў па пытаннях сацыяльных нарматываў і мінімальнай заработнай платы", які ўступіў у сілу з 15 лістапада 2021 года, памер месячнай мінімальнай заработнай платы ўстанаўліваецца Саветам Міністраў па прапанове Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях.

Калектыўным дагаворам (пагадненнем) можа быць устаноўлены іншы памер месячнай мінімальнай заработнай платы, але не ніжэй памеру, устаноўленага заканадаўствам.

Памер гадзіннай мінімальнай заработнай платы ў адпаведнасці з артыкулам 5 Закона Рэспублікі Беларусь ад 17.07.2002 №124-З "Аб устанаўленні парадку павышэння мінімальнай заработнай платы" (далей-Закон) вызначаецца наймальнікам.

Гадзінная мінімальная заработная плата вызначаецца шляхам дзялення памеру месячнай мінімальнай заработнай платы на суадносіны разліковай нормы працоўнага часу каляндарнага года, усталяванай для адпаведных катэгорый работнікаў наймальнікам у адпаведнасці з заканадаўствам аб працы, і колькасці месяцаў каляндарнага года.

Наймальнік абавязаны прымяняць мінімальную заработную плату (месячную і гадзінную) у якасці ніжэйшай мяжы аплаты працы работнікаў за працу ў нармальных умовах на працягу нармальнай працягласці працоўнага часу пры выкананні абавязкаў работніка, якія вынікаюць з заканадаўства, лакальных нарматыўных прававых актаў і працоўнага дагавора. Пры гэтым мінімальная заработная плата прымяняецца з улікам адпрацаванага працоўнага часу.

Заканадаўствам Рэспублікі Беларусь устаноўлена адказнасць за парушэнне заканадаўства аб устанаўленні і парадку павышэння мінімальнай заработнай платы. У прыватнасці, у адпаведнасці з часткай 3 арт. 10.12 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях налічэнне заработнай платы ў памеры ніжэй памеру мінімальнай заработнай платы цягне накладанне штрафу на службовую асобу ў памеры ад 4 да 50 базавых велічынь.

**Таццяна Вяржынская,**
галоўны дзяржаўны інспектар
Смаргонскага міжраённага аддзела
Гродзенскага абласнога ўпраўлення
дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы